Галіна Лубянецкая

# АНАДЫЯМЭНА

Мінск
"Медисонт"
2008

KAMUNIKAT.org

УДК
ББК
Д

*Бібліятэчка часопісу "Дзеяслоў".*
*Выпуск 8.*
*Заснаваная ў 2006 годзе.*

**Дубянецкая Г.**
Анадыямэна: вершы. / Галіна Дубянецкая. – Мінск: "Медисонт", 2008. – 92 с. – (Бібліятэчка часопісу "Дзеяслоў"; вып. 8.)

ISBN

"Анадыямэна", "тая, што ўзьнікла з мора" – кніга вершаў, што ўзьніклі, як паўстае да жыцьця жывое, – з "мора" непраяўленасьці – на покліч любові – на здабыцьцё сімвалічных "ключоў" да "незачыненай брамы" сэнсу.

© "Дзеяслоў", 2008
© Галіна Дубянецкая, 2008
© Афармленьне.
СТАА "Медисонт" 2008

ISBN

# Сьвята самоты (а. т.)

праточваецца неба
праз лістоту
сьвятло і цень
завязваюцца ў гронкі
ды лашчыцца да скуры
летуценна
ядвабны вецер
ветраны ядваб

крылатаю
смарагдавай істотай
прысела лета
на ражок старонкі
імгненьнем
запалоненая вечнасьць
ды ў локці ўдрукаваная
трава

## Па-над лесам

па-над лесам
па-над часам
беглі думкі самапасам
беглі
збрыквалі далоў
сям ды там
падкоўкі слоў

KAMUNIKAT.org

## Парушынка

гэй – да – гэй на кані
крылатым
аж такою глядзіш
каралеўнай
нібы ўпала табе багацьце
проста ў прыпол плашча

прызнайся:
вырасла сьвята
з парушынкі
амаль прыкметнай
якую змахнуў *той дзядзька*
сёньня з твайго пляча??.

KAMUNIKAT.org

## Шкло

сто разоў памру і ўваскросну
за хвіліну размовы з табой
быццам ткуцца празрыстыя кросны
да трымценьня напяты спакой

ты ні словам не дапаможаш
назіраючы з вежы ўгары
як у пошуках брамы абходжу
этыкету шкляныя муры

узіраецца ў зьвівы блуканьняў
навакольная плыўкая ймгла
я цябе празрыстаю зданьню
абдымаю праз холад шкла

## Калыханка маме і тату

ноч зазірае ў вокны
      пільным ліхтарным зрокам
бацькаў прыймач паўсонны
      трызьніць рачным чаротам

вее шыпшынаю й кропам
                  з маміных мрояў
водгук самотных крокаў
                  важкасьць патроіў

наканавана рэчкам...
      дыханьне бацькоў зьлілося
наканавана спрэчкам
            плавіцца ў суґалосьсі

коціць адзін каменьне
            круціць другі пялёсткі
лучацца два струмені
            я — іх сутоку плёскат

перамаўляюцца душы
            покуль у сьне натхнёна
бацька бастыльлі крушыць
                  мама гадуе півоні

...зьняці каб людства з крыжа...
...справіць дачушкам вясельлі...
...лодку ў сутоку калыша
            ...я засынаю ў фатэлі

## Сьнежная мроя

*Сон-пасланьне*

ад сьпёкі ў вачох страката
...пляжным панам на пацеху
лепіць заўзята
Гефест барадаты
постаць з чыстага сьнегу

...а жвір — з вугольля ды жару
ява канае ў палоне
сьнежнае мары —
сьнегу ахвяру
творачы стынуць далоні

...крохкія сьнежныя пальцы
лёд апякае сэрца...
ў пекле на гальцы
помнік русалцы
лепіцца як пяецца

...узьнікла — стаіў дыханьне
сьніцца нібы... сплывае...
а раптам: адтане
пачуе
паўстане
з Нівечы выйдзе — жывая?!

kamunikat.org

ня ведаў — стаіць на ганку
...выйшла – гукнуць нябогу...
ды чорнай маланкаю
ночы пасланка
чыркнула перасьцярогу

KAMUNIKAT.org

## Хваля адхлыне

хваля адхлыне
    вернецца вобмацкам
слова застыне
      выблісьне позіркам

не наталіцца
            снамі шалёнымі
зноў блiскавiцай
               вочы зялёныя

крэсьліць міжброўе
            паскамі паскамі
тоіць бязмоўе
                  пастку нам

хованкі пошукі
               мроі гарачыя
позіркаў дотыкі
    ...моўлена —
                  страчана?..

золкам апошнім
              зоры схаваліся
Божа нашто ж мы
                  уратаваліся

## Амарылісы

амарылісы амарылісы
запалілі ў сьцюжу пакой
пасварыліся пасварыліся
сэрца з розумам
цела з душой

амарылісы амарылісы
гэта вокны сплываюць крывёй
раптам раны старыя адкрыліся
і жахнулі сваёй глыбінёй

вусны колеру амарылісаў
ліхаманкавы неспакой
як жа лёгка мы дружа скарыліся
ледзь крануўшы вагонь рукой

кроў пунсовая амарылісаў
а за вокнамі белы шал
што згадаць каб зноў памірыліся
сэрца з розумам
з целам душа

амарылісы амарылісы...

## Вар'яцыя

лесьвіца вілася і вял*а*
не да сьвятла
бязважка танчыў
на прыступках кволы блік
а потым зьнік

побач не намацваю рукі
і мрок такі
мой вокліч
кола цішыні абег і сьціх
ля ног маіх

крок мой наступны зрынецца ў прадоньне
і сьціхне боль і сьціхне боль
зрок мой нарэшце вырвецца пад промні
праз гэту столь

і ніяк ня здолею забыць
ні зьнелюбіць
навошта Ты мне
мой стакротна сьветлы Бог
душу зьбярог

ёсьць вакно а лесьвіцы няма
ці ўсё — дарма?..

о толькі
дзе жыве сапраўднасьць адкажы
не на крыжы

зрок мой нарэшце вырвецца пад промні
праз гэты боль праз гэты боль
крок мой няўцямны адхілі ад гэтай проймы
і не дазволь

KAMUNIKAT.org

## Яснасьць

хмары што сьвет мой ад неба
хавалі ў сівой абалонцы
аднойчы апалі сьнегам
і адтулілі сонца

сьвет мой задумна-сутонны
цёплы утульны ды гразкі
раптам зрабіўся бяздонны
чысты сьцюдзёны ды ясны

кужаль зямнога цяжару
срэбны кінжал пакроіў
курчацца ў белай пагары
кволыя крылцы мрояў

як жа ж бліскуча й сьмела
ў неба ўпінаюцца вежы!
ўціснуты ў цеснае цела
пругкі шматок бязьмежжа

безвач — куды?.. — ірвецца
кліча — каго?.. — шалёна
плача шкадуе сэрца
колішняга палону

сьвет мой пустэльна-шырокі
сьвет мой сьляпуча-голы
...аднойчы расталі аблокі
дзе сноўдалі цені анёлаў

KAMUNIKAT.org

## Даратэя

*сястры*

Даратэя вар’ятка сястрычка
скінем тут на страсе чаравічкі
пусьцім ціха ў сябе Сусьвет
хай нас поўняць шэпты прасторы
хай пранізваюць промнямі зоры
я гатовая ў шчаснай пакоры
падзяліць твой крылаты сакрэт

не збаюся — о не, Даратэя
я сама на нябёсы хварэю
колькі трызьніўся мне гэты крок
расхінала душа абалонку
і выпроствала ў бездань далоньку
дзе – у цемры пад скураю тонкай —
пульсуе сьвятло як кроў

дай руку Даратэя сястрыца
я табе не дазволю разьбіцца
я ня ноша твая а крыло
засынаюць пад стрэхамі звадкі
сьпіць да ранку мянушка *вар’яткі*
астываюць балючыя згадкі
і Сузор’е наша ўзышло

дык ляціма ж ляцім Даратэя
і наведаем колькі пасьпеем
Галактык планет і рас
я упарта зацята ня веру
што *паўсюль* пяшчоце й даверу
панаставіў розум *бар’ераў*
як тут між людзей у нас

KAMUNIKAT.org

## Тонкаю ўсьмешкаю

тонкаю ўсьмешкаю
квадра апошняя
люстрыцца ў цемры вытокаў

лёт засьляплёны
між сьмерці-ўваскрошаньня
жар дарагіх апёкаў

KAMUNIKAT.org

# Горад

ці глыбока ці далёка ці блізка
праплывае ў пераменлівых блісках
дзіўны горад апавіты зарою
дзе жывуць нерасказаныя мроі

а падасца – гаманілі званіцы
бы хацелі да кагось дазваніцца
і падобныя да сноў распавесьці
пра жыцьцё тамтэйшае весткі

можа ў сьне а можа ў яве аднойчы
хтось адплюшчыць праясьнёныя вочы
і ў азураваe ўвойдзе сьвітаньне
і званіцы залатыя застане

KAMUNIKAT.org

# Сьвітае

горад разгортвае ветразі
на самых высокіх вежах
сотні ружовых ветразяў
на комінах самых стромкіх
поўняцца грудзі ветразяў
ранішнім ветрам сьвежым
лопат нябёсных ветразяў
подых вялікай вандроўкі

KAMUNIKAT.org

## Балада часу

*маме*

маленькія ножкі лісьцём шамацелі
бы недзе хто клікаў — лётма ляцелі

праз вулкі ды золкі праз дні ды гадочкі
за ножкамі беглі малыя сьлядочкі

раўкі ды пагоркі насустрач мільгалі
сьлядочкі за ножкамі не пасьпявалі

Вясьнінку дзяўчынку прыстань на хвілінку
чыё гэта ўпала пяро ў ручаінку?..

— Мо вырай?... авохці  як час пралятае!
мінаецца лета і нас не пытае

маленькія ручкі ў цяжэнькую ношку
з усякага поля зьбіралі патрошку

у плёнах ды клопатах час адбіваўся
а сам не лавіўся а сам не даваўся

Мама!.. — а можна здагнаць павуцінку?
...а можна пакратаць рукой аблачынку?..

— Няможна бо ўкусіць віхура ліхая
зіма надыходзіць і нас не пытае

узорамі яснымі леглі сьлядочкі
а кошык паўнюткі павыбралі дочкі

панеслася недзе адна ручаінкай
другая кудысь паплыла аблачынкай

кудысьці — праз нетры...
кудысьці — на строму...
а хоць бы вярнуліся цэлы дадому

чакае матуля званка ці радочка
ну хоць бы маленькага знаку-сьлядочка

нібыта й даверыцца вышняй спагадзе
а ўсё не прыстане а ўсё не прысядзе

— Ты ж Матухна Дзева глядзі безупынку
маю ручаінку маю аблачынку

хто ведае — можа й патрапіць якая
дабегчы й зірнуць куды час уцякае

## Pianissimo

...тую музыку
мармытаньнем
заглушае рака
яе не чутно за граньнем
гарэзы-красавіка

і ўсё-ткі калі струною
напружыцца слых
кране яго нотай
раптоўнай самоты
нібы плач  званочкаў малых

то – ільдзінкі
ільдзінкі
ільдзінкі
сьненьняў зімовых лушпінкі
ціха-ціха ля берага
цінькаюць
кінутыя калядой

нізак елачных крышталінкі
дажываюць свае хвілінкі
і дрыжаць галасочкі ценькія
над абуджанаю вадой

і цішэй —
і цішэй —
і расталі
толькі лёгка ўсхліпваюць
хвалі
наскрозь крыштальныя хвалі



## Зьява

усё пакрывіла й замгліла сьляза
і тайна: ні шэпту
ні ўсклiку
не раны зьяўляешся мне паказаць
— нязводныя шнары бяз ліку

а там дзе сьвітае
высока ўгары
там вочы як золак шэры
як дзень заблуканай у часе пары
куды не знаходзяцца дзьверы

KAMUNIKAT.org

## Шукаю ключы

у срэбры елачных цацак
шукаю ключы
пад попелам леташніх масак
шукаю ключы
праз полымя будучых красак
шукаю ключы

шукаю шукаю шукаю
шукаю ключы

з кропляў адбіткаў ценяў
стwараю ключы
з полыскаў блікаў мігценьняў
стwараю ключы
з дзіўных (не) супадзеньняў
стwараю ключы

стwараю
спрабую
кідаю
і зноў і зноў падбіраю
да брамы сваёй немагчымай
можа і не зачыненай

## Шлях

*Алесю Разанаву*

імгненьні музыкі
стагодзьдзі паўз
вартуе вартае разгубленая муза
агню ў крышталях
жудасны запас
у іншасьвеце парасткам прымуся

чаканьне музыкі
трымценьне адплыцьця
настройка боскага аргана
вугольле гольля
полымя лісьця
вярэдзіць вецер апантана

маўленьне музыкі
жыцьцё –
бяз паўз
агню з крышталяў сьпее вызваленьне
не для сябе
сабой
за нас
у іншасьветы вечнае ўжыўленьне

## Палёт

раскрыжаваныя на промні
ляцім: прасьветленасьць і жах
і адгукаюцца прадоньні
грымотнай музыкаю — *шлях*

сьляды пакінутыя ў снах
жыцьця вакенцы-вачаняты
сьветабудовы стромкі гмах
намацваем *каардынаты*

аб камень шорхнулі зярняты
але не прыпыняй хады
прасьцяг і час табой працяты —
адрэзак сьветлы: *назаўжды*

прамень кранаецца вады
адбіткі лучацца ў сьвячэньне
і вее вецер малады
нястрымнай хваляй —
*адраджэньне*

як бор смалой табой струменю
вар'яцтва і сьвятло маё
ляціць — пагібель ці збавеньне —
*стралы*
насустрач
*вастрыё*

## Падхапілі

...падхапілі падземныя плыні
і злучыліся скалы ўгары
кіравалася — да вяршыні
апынулася – унутры
адгукніся Ўладар Гары

сходы стромыя.... бракуе зьвёнаў
дрогкі сьветач апрануты ў мрок
па збавеньне – прытулак сьнёны:
цёплы дотык... жывы глыток
я ішла да цябе здалёк

хто галактыкі слоў разгорне
хто спасьцігне меладый віры
ува мне скрыжаваліся промні
адгукніся Ўладар Гары

гэта – ў зорчыных нетрах блуканьне
гэта боль рассьвятляецца ў зрок
чую сэрца тваё Вулкане
я ішла да цябе здалёк

рытмы роднасьці: не скары
анямела мільёнаструньне
адгукніся Ўладар Гары

так сасьмягла шукаю выток
так цягнуся балеснаю руньню
я ішла да цябе здалёк

рэха з лісьцем зрываюць вятры
адгукніся Ўладар Гары

лісьце з шумаю зносіць паток
я ішла да цябе здалёк

KAMUNIKAT.org

## Сьветабудова

сьветабудова
сьветаруйнаваньне
між быльнягоў
заклятымі
завулкамі
маўчаньня
блукае
беспрытульная
любоў

KAMUNIKAT.org

## Звон

самотны звон хіліўся над вадою
тварыў заклён
душу аблытваў срэбнаю тугою
залётны звон
душу аблытаў горай ад павою
пайшла ў палон
пакаштавала хмельнага напою
начэй і дзён
пакаштавала... быццам за смугою
сасьніўся сон
пра хмельнае аблуднае сьвятое
жыцьцё і скон

## Нявымоўнасьці

нявымоўнасьці мова
і сінія вочы сутоньня
спавядальны празрысты
трапеча над сьвечкаю тон
мы будуем паветраны мост
што ніколі ня злучыць прадоньня
і гайдаецца ў звоне вячорным
нявыліты стогн

нявымоўнасьці мова
за чорнымі веямі ночы
запытальна стаіўся
глыбока-глыбокі пагляд
ён пільнуе няўцямнае хвілі
калі ты аднойчы
з ім адпусьціш душу
ды ніколі ня вернеш назад

нявымоўнаю мовай
ружовыя вусны сьвітаньня
абяцаюць сьцяжыну адкрыць
да прысьнёных вакон
і памкнешся кудысьці
і зноўку закружаць блуканьні
і ніводны ніколі
дарэшты ня спраўдзіцца сон

нявымоўнасьці мова
і дня залатыя далоні
асыпаюць пялёсткамі мрояў
закінуты сад
і прыгорне зямля цябе ціха
да цёплага ўлоньня
і — ужо не адпусьціць
ніколі-ніколі назад

нявымоўнасьці мова
і сінія вочы сутоньня
і за чорнымі веямі ночы
нявыліты стогн
і сьвітаньня ружовыя вусны
і дня залатыя далоні
і праменны празрысты бясконцы
няспраўджаны сон



KAMUNIKAT.org

## Заблукаць

заблукаць і згубіцца ў табе
затануць у жамчужнай затоцы
і ня чуць як вецер штомоцы
шкуматае гальлё на вярбе

і аб тым не гадаць і ня ведаць
што вакол залягглі халады
і замглілася ўлоньне вады
і адстала ад выраю лебедзь

колькі выраяў праміне
колькі перлін затояць глыбіні
столькі зім па табе яна стыне
столькі зім ён галосіць па мне

KAMUNIKAT.org

## Сьцякалі ў сон

*С.*

сьцякалі ў сон
зьбялелыя лугі
плылі па замку
цені ў паланэзе
вызвоньвалі самоту
ланцугі
...і крылы Фенікса
адбіліся на сьнезе

о як цярпліва
па вітку віток
разблытаю ўратую
разьняволю
о як адхукваў
і па кроку крок
вяртаў з няіснасьці
да сьвету і да болю

...і паддаваліся пячаткі
пакрысе
і ажывалі вочы вусны веі
прыклікаў на падмогу
чары ўсе
вады агню сутоньня і завеі

вязьніцу вольнасьці
яшчэ яшчэ хісьні
як лёгка дыхаць
у тваім палоне
на белым полі
крохкай цішыні
выява Фенікса
прароствае зялёна

...ці веру?..
ды наструньваецца слых
на хвалю повязі
ў няўцямнай празе
ці помніш:
за прыручаных сваіх
мы назаўжды
прад Богам у адказе

KAMUNIKAT.org

# Ты ахоўваў

*Сяргею*

ты
ахоўваў вагонь
я вяла да вады
і замовы шаптала завея
нецьвярозы
узор выплятала сьляды
а далей
распавесьці ня ўмею

ты
вяла да вады
я ахоўваў вагонь
і завея шаптала замовы
непрытомна
трымцела ў далоні далонь
а далей
што ня месьціцца ў словы

kamunikat.org

## Насустрач

па браме
разводзіцца брама
па дзьвярох
растуляюцца дзьверы
па заслоне
заслона спадае
адхінаецца
тонкі вэлюм...

не суроч! —
дыханьне займае —
не суроч...

супыняецца час

KAMUNIKAT.org

## Купальле

дзень яснакрылы веі стуляець
травы малітваю водар ліюць
дзеці Ярылы сьпеў пачынаюць
шэрыя цені з багны ўстаюць

ноч сінякрылая ў месячным чоўне
выплыла зоркі-лілеі зьбіраць
дзеці Ярылы выкрэсваюць промні
шэрыя цені воддаль дрыжаць

хорам адкрылі скінулі сходні
з вышаў сьвяцілы на вогкі мурог
дзеці Ярылы ўзьнімаюць паходні
шэрыя цені вартуюць мрок

плоймы жарынаў пад неба шугаюць
зараз уголас адкажа Сусьвет
дзеці Ярылавы Кветку шукаюць
шэрыя цені цягнуцца ўсьлед

раньня вятрылы срэбрам нальюцца
браце ў тумане са шляху ня збоч
дзеці Ярылы за рукі бяруцца
шэрыя цені хаваюцца ў ноч

## Ёсьць раскоша

ёсьць раскоша згадаць недарэчы
пра шамрок ці аер
ёсьць у вулках раскоша сустрэчы
незнарок у чацьвер

і прамень заблуканага сонца
у пражылках дажджу
і няўзнак прашаптанае слоўца
што закружыць душу

ёсьць раскоша сьцяжынаю крочыць
наўздагад напавер
ёсьць усё што бывае аднойчы
толькі тут і цяпер

KAMUNIKAT.org

## Пасярод вятроў

пасярод вятроў
абудзіўся зноў
перагуд званоў

да сьвятых муроў
залатых крыжоў
чалавек пайшоў

ад зямных шляхоў
ад сямі грахоў
пад нябёсны схоў

ад сьпякот-завей
ад шаўковых вей
па сьвяты алей

ад прадонных воч
у сьляпую ноч
пацягнуўся ўпроч

не шапчы замоў
не чакай лістоў
не шукай мастоў

хай сьцякае кроў
у глыбокі роў
да сьвятых муроў

над вадой вадой
        над жывой табой
                    ледзяны павой

над гарой Марой
       за ракой Угрой
       пырснуў дзень крывёй

між барвяных рос
       дзьмухавей прарос
               уваскрос Хрыстос

KAMUNIKAT.org

## Малітва

у капліцы Тваёй
запалі мяне ціхаю сьвечкай
прад абліччам Тваім
у сутоньні мяне запалі
на зьмярканьні сьвятла
блаславі мой самотны вагеньчык
на зьмярканьні душы і любові
на гэтай зямлі

прад абліччам Тваім
дай гарэць трапятліва і ясна
чысьціню Тваіх рысаў
на хвілю замгліць не дазволь
а як чэзнуць пачну
загасі мяне воляю ўласнай
у бажніцы Тваёй
дзе зьліваюцца міласьць і боль

## Чуеш

чуеш альшына роніць лісток
веецца сьцежкай белы пясок
точыцца зьнекуль гаркотлівы дым
дыхаю Імем Тваім

KAMUNIKAT.org

## Сьвята самоты (р. т.)

прыйдзе спатоля ці
згоркне й высахне смага
але ня кіне вада намываць
адлюстроўкі
з нейкіх узьмежжаў
куды не сягае развага
колішні смутак вяртаецца
ўздыхам палёгкі

цьмее між хвілямі водсьвет
нейчых паглядаў
любых нязнаных
асмужаных дальлю абліччаў
нешта няўчутнае
просіць-ня-просіць спагады
нешта няўцямнае некуды
кліча-ня-кліча

## На тым баку

*бацькавай душы*

сьвятло ва ўсьмешцы тваёй
і растае неспакой
а ўжо анёл над табой
схіліў крыло
нацяты боль цецівой
і рвецца белы сувой
і безнадзейны міжбой
і зьмярканьне надыйшло

але вяртаецца ў снах
наш непражыты працяг
і абдымае прасьцяг
тваё крыло
па промнях і камянях
па непрыкметных сьлядах
ледзь толькі вывеў на шлях
і зьмярканьне надыйшло

на тым баку цішыні
свой вольны лёт прыпыні
і стуль згары з вышыні
схілі крыло
ня зьнікні не праміні
сядай са мной пры вагні
я больш ня плачу зірні
і зьмярканьне надыйшло





## Аціхла залева

аціхла залева
і вецер пагойдвае зрэдку
на кволай сьцяблiне
вялiкую вогкую кветку
абернуты келiх
і больш нi халодна й нi цёпла
сьлязою на донцы
мігціць недапітая кропля

расстайны ня вернецца позiрк
далiнай замглёнай
стулiлася неба наўсьцяж
непранiклай заслонай
абернуты келiх
пралiтыя точацца сьпевы
з пялёсткамi бавiцца вецер
заціхла залева



KAMUNIKAT.org

## Наўздагон

*татку*

сьцішна вада шапоча
тоне пылок вярбовы
ў цёмных вірах
штосьці сказацца хоча
ды заблукалі словы
ў цёмных барах

човен убіўся ў травы
што табе не плывецца
рэчка мая
стрэне пагляд ласкавы
што табе не жывецца
доню мая

зблытана багавіньне
ды на крывой вярбіне
лісьця няма
спыненыя аблокі
з гэтай дзіця затокі
выйсьця няма

## Ты глядзіш

...ты глядзіш у смугу дзе кружляюць лісты
безыменна
і адлюстраны зрок
размыкае абрысы вакна
з глыбіні краявіду ўзыходзіць
Анадыямэна
беспрытомнаю зоркай
між явы блукаць давідна

...гэта час калі ў прыцемку моляцца
золкія кветкі
і нябачнае мора
варожыць кірунак любы
тут пакінулі срэбную вопратку
сёстры-падлеткі
і цішком падхапілі і зьнесьлі яе
галубы

...адплываюць удалеч
пристанкі сьцяжыны і людзі
суціхае пачуцьцяў і думак
успуджаны грай
і спасланая ласкаю
музыка весьці нас будзе
і нячутна пяройдзены
зьнікне ў смузе небакрай

...будзе музыка правіць палёт
у празрыстыя зманы
будзе млосьць і пустэча
і ледзьве адолены крок
і тады прашапоча мне рэха
што ліст атрыманы
і да ног падплыве
залаты дзьмухаўцовы вянок

KAMUNIKAT.org

## Спарышы I

морак на дне віроў
студзіць крутыя ўзвары
ціха праточацца ў кроў
яе дрыгвяныя чары

з пасмаў павольнай пары
з водару аяроў
повед плятуць імшары
пад перашэпт вятроў

трызьняць на дне віроў
стоеныя абшары
мне атруцілі кроў
яе дрыгвяныя чары

## Лозы гострыя

лозы гострыя перавіцеся
сьцежкі простыя закруціцеся
зварухніцеся лёхі вогкія
адгукніцеся ўздыхі дрогкія

разьвіні туман зрэб'е рванае
агарні красу непадманную
ад зьвярыных лап
              ад быдлячых ног
затулі яе дрыгвяны трысьнёг
ад вужачых джал
              ад назольных пчол
ясны сон яе сьцеражы анёл

падымайся чмур па-над багнаю
адвядзі далей вочы прагныя
адвядзі далей крокі сьмелыя
прэч ад хораму Кветкі Белае

зоркі зводныя разбрыдзіцеся
страхі сподныя абудзіцеся
падарожнага замарочвайце
на абходны шлях заварочвайце

## Багоньнік

*Адаму Мальдзісу*

там у цэнтры сусьвету
спляліся хмызы
атуліўшы сабой балацінку
у высокім трысьці
там Багоньнік сядзіць
і задумліва дзьме ў чарацінку

расьцякуцца наўкол
між лазовых кустоў
тыя звабна-самотныя клічы
павыходзяць істоты
з патайных кутоў
і дзівосныя зьявяць абліччы

павылазяць насельнікі
рэк ды пяскоў
духі нетраў разлогаў ды вышаў
хтосьці зьзяе-мігціць
пераліўнай луской
хтосьці пер’ем адвабным калыша

нібы ў хорам на сьвята
прыносяць яны
кожны — хто чым багаты —
дарункі

нізкі перлін ды ягад
мяды-бурштыны
ды сьвятлістыя гойныя трункі

а ён дзьме ў чарацінку
ў салодкай нудзе
ды праяваў дзівосных ня бача
гэта недзе маўляў
гурт авечак брыдзе
гэта вецер нясе брэх сабачы

а ён грае нібы
ўва ўсім сьвеце адзін
а ён вочы заплюшчыўшы грае
супакойліва недзе
парыпвае млын
ды палязгвае кузьня старая

а як стоміцца граць
ён з хатолкі тады
пракаветны свой бохан вымае
і грызе ў задуменьні
а трункі-мяды
ненаедная багна глынае

ён сядзіць у трысьці
у сівой пекнаце
у паставе сваёй непаўторны
а навокал дрыгва
дзівакветам цьвіце
ды гукаюцца з небам валторны

## Хто мы

хто мы ў тваім дыханьні
ласкай спасланы вечар
хто мы бязьмежных выспаў
цixiя ўладары
не дазавецца голас
дотык не дакранецца
толькі вагонь трапеча
толькі сьвятло гарыць

болем уцелясьненьня
мовай таёмных знакаў
і асалодай скону
злучаныя маўчым
і не кранууцца вусны
белых пялёсткаў маку
і не кранем нічога
і не кранемся нічым

толькі бяссоньне ў кельлі
толькі вагонь на выспе
толькі між зораў зорка
між абразоў абраз
... і ў цішыні дасьпелай
і ў вызваленьні існым
сьвята сустрэчы нашай
спраўдзіць нарэшце нас

kamunikat.org

## Прадоннае сонца

прадоннае сонца
ружовіць глыбіні
*туманам і звонам*

туманам і звонам
зацягне сусьветы
*ну дзе ты мой гожы*

ну дзе ты мой гожы
мой мілы ну дзе ты
*у сонцы прадонным*

у сонцы прадонным
згарае галінка

KAMUNIKAT.org

## Веру

веру ў сэнс усяісны
і ў хвілях разьлітую ласку
уваходзячы ў лес
апавіты туманам густым
...і сплятае гушчар нада мной
непамысную казку
асьвячоную ў роспачы
Імем Тваім

KAMUNIKAT.org

## Заблукаеш

заблукаеш: не спаткаеш
а спаткаеш — не спазнаеш
пераступіш: не разгледзіш
а разгледзіш — не дастанеш

а наперад глянь —
твань
а паткніся ўбок —
цмок
а ступі назад —
гад

вусьціш хісткая пахі млосныя
нетра дзікая цемень грозная

асьцярожны крок
ды набіты гуз
што ж ты ўдзерся ў мрок
ды з душой загруз?..

што ж ты моцы трывожыў
дрымотныя
у пралазы лез незваротныя
ды між немачы
між паганае
выглядаў-шукаў Негублянае?..

Кветка Белая
не наўзбоч дарог
Кветка Белая
па сямі сьмярцёх
а здалёк мігціць
недасяжная
а за крок стаіць
незаўважная

не хадзіць вам душы няўмелыя
каля тайніцы Кветкі Белае
не глядзець вам вочы няздарныя
на красу яе панадхмарную

KAMUNIKAT.org

## Быццам адтуліна

месяц – каторыя – справіў народзіны
ветах ня сьпіць насупраць
быццам адтуліна ў яву адрозную
нейчая ў сьвеце прысутнасьць

вочы замружу ў тайныя люстры
безданяў-спарышоў
перш чым гукаць адамкнуліся вусны
ясны мне водгук прыйшоў

возера ў возеры срэбрам адсьвечвае
вёслы вясьляр адпусьціць
поўняю сноў разьліваецца вечная
вечная сьпеўная сутнасьць

лёталі яскі — ўпалі зярнятамі
квет мой зьбярэш наводдалі
явы жамчужніца — вечкі разьнятыя
ўмыюцца хваляй водгульля

ноч пазірае ў прасьветліну месяца:
што там за дзень — насупраць?..
Госпад з табою чыя мне праменіцца
блізкая ў сьвеце прысутнасьць

кветам нярушаным
песьні над песьнямі
ява ўцякае
ў сны
недасьнёныя

## Скуль ты

скуль ты пасланьнік горкі
вецер — шчакой прыпасьці
стуль дзе прытуляць зоркі
адлучаных ад прычасьця

літасьць ляза і джала
пройдзе вытокі сэрца
барваю набрынялая
ружа ў вялён спаўецца

доўгі вялён завеяў
пасма няўцямнай руні
там у спалохах веяў
росчырк ляза даруй мне

KAMUNIKAT.org

## Галінкаю тою

галінкаю тою
якая згарэла
галінкаю тою

насустрач хітнецца
аціхлае рэха
насустрач хітнецца

праз месяцы й сонцы
і горныя стрэхі
праз месяцы й сонцы

параніць раптоўна
як водгульле стрэлу
параніць раптоўна

прадоннай тугою
аленяга рэву
прадоннай тугою

з нябыту прарвецца
і ліне ў прарэхі
з нябыту прарвецца

праз межы й разоры
і горкія рэкі
праз межы й разоры

кранецца бязмоўна
адвечнага дрэва
кранецца бязмоўна

## Забірай

Гаспадарыня Дрыгва Матухна
не прайсьці паўзьверх
не дастаці дна
валакуць віры ня ўтрымацца мне
у тваім нутры захлынацца мне
забірай жыцьцё маё марнае
разам з мараю панадхмарнаю
пахавай маё сэрца няўмелае
каля хораму Кветкі Белае

я шукаў яе
сярод ночанькі
чуў як дыхае
недзе моўчанькі
лёгкім шолахам
навяваецца
чыстым водарам
прыліваецца
азываецца —
не з-пад пнёў-карчоў
дзесь бліжэй
бліжэй
...сустракай
...прыйшоў

kamunikat.org



## Канец блуканьня

канец блуканьня белая даліна
агні
алень паранены — у засені язьміну
засьні

пад гуды леры зьмеркнецца і згіне
твой мінатаўр
вянец надзеі на чале багіні
аер і лаўр

зара ўгаіла рану і сьлязіну
зірні
канец блуканьня белая даліна
агні

## Спарышы II

выплыве ў пасмах пары
чoвен без весьляроў
выпрастаюць пачвары
шыі свае з яроў

туліцца ў цень дуброў
цэліцца лучнік яры
сэрца маіх віроў
грому вяртае ўдары

стогнам залье абшары
мая адамкнёная кроў
пер'е разьдзёртай хмары
сонца на дне віроў

## Жыцьцё

бясцэнных крышталяў гронкі
катуй выпрабоўвай грозь
жыцьцё: трапяткія старонкі
абцалаваныя скрозь

і немач — і моц — і лекі —
з атрутаю: ў самы раз
а тое што ўтояць павекі
маўкліва праменіць абраз

і сэрца — адкрытая бездань
адзіны праменіць сэнс
і вечар — шалёным бэзам
і плынямі — паланэз

і прымуць нотныя знакі
усю невымернасьць агню
літаньні праклёны падзякі
кахаю чакаю сьню

## Узыходзіла сонца

узыходзіла сонца ў вазёрнай
смузе
а ўжо высьпелы дзень
дагарае салодка
нас ад стомы бязважкіх
кудысьці вязе
нас дадому вязе
паслухмяная лодка

KAMUNIKAT.org

## Ля той ля

ля той ля ціхай лагчынкі
дзе сон снуе павучынкі

там пеўнік ходзіць па плоце
заход галоўкай залоціць

ня знае пеўнік спачыну
шчапае з плота лучыну

красае полымя грэбнем
кідае ў вокны царэўнам

ляці ты пеўніку спаці
ня трэба плота шчапаці

ня руш нам ціха-азерца
ня садзь нам стрэмак
пад сэрца

kamunikat.org

## Гэткі гармідар

гэткі гармідар
сонечных блікаў
хованкі-спраты
зьмерклая радасьць
хто цябе клікаў
з прорвішча страты

раптам заграе
золкая стрэмка
дзідай на ўзьлёце
неразабранага
квету бярэмка
зьдзіваў суплёцьце

KAMUNIKAT.org

## Схаваюся ад перуна

...схаваюся ад перуна
на дне звана
а звон спакою не дае
грыміць пяе

...адбаранюся ад стралы
крылом пчалы
а пчолку як што апякло:
пусьці крыло!

...няма ратунку хоць крычы
наўпроць начы

— ці можаш, вір, у каламуць
мяне ўхінуць?
— магу, ды ўсё тут у віры
відно згары

— дык памажы мне схоў знайсьці
ў густым трысьці
— ад той вуды табе й трысьнёг
не абярог

...куды ж то кінуцца куды
з такой бяды
няма ратунку хоць гукай
за небакрай

...нашто дзяруся на гару?
— гукаць зару!

## Яшчэ табе няўцям

*Дзе ты быў, Алеф?*
*Я г в э*

яшчэ табе няўцям якое біла
пайшло ў разгон
твой замак сеткаю злавіла
гайня варон

гэй валадар гарыць твая даліна
прытулак сноў
па нерушах паўзе шляіна
чужых сьлядоў

сам ад сябе ва ўрочышчы бязмоўя
таіў-бярог
паглянь як вугліцца кустоўе
смыліць мурог

## Fatiguée*

fatiguée de cet équilibre
sur la pointe d'un couteau
je ne rêve qu'à la tombée libre
jusqu'au bas
mon amour fais-moi un tombeau
de tes bras

---

## *Стаміўшыся

стаміўшыся ад гэтай раўнавагі
на вастрыі нажа
адное мрою вольнае падзеньне
дакуль ёсьць дол
мой любы дамавіну мне зрабі
з рук тваіх

*(падрадкоўнік аўтара)*

KAMUNIKAT.org

## Жар спадзе

*... і Я стварыў сьвет праз Бэт*
*Я г в э*

жар спадзе
зямлі ў сарцавіну
папяловы адкружыць баль
узрывае
зьмярцьвелую гліну
сіні міжзорны крышталь

незнаёмка
зьявіцца ў сінім
сінія ўскруціць віры
што гэта значыць —
"астынем":
зрынуцца з гэткай гары?!

## Я ведаю веі

я ведаю веі даўжэйшыя
ад цёмных ад гэтых
мне чуюцца прорвы глыбейшыя
па іншасьветах

ды зьнекуль надзьмула на сьцежку мне
лёткіх жарынаў
спрабую прабрацца ўзьмежкамі
а яны пад ногі: гары нам!

за якімі ж сонца нябёсамі
аблічча сваё хавала
як на кут мой чорнымі восамі
абрынулася навала?

дзе маё сонца высокае
каму ты сьвяціла
той ночы што цёмнымі сокамі
мяне атруціла?

## Ноч

...ноч несьвітальная
мроівам чорных пялёсткаў
крые шапоча
зашэптвае мёртвыя раны

...дай абудзіцца
й расьцепліць кавалачак воску
новаю сьвечкай гарэць
да Цябе мой абраны

...ведаю: сонца глыбокага ўтоены ўздым
*зрушыцца* Імем Тваім

KAMUNIKAT.org

## Крозы

снаваньне крозаў
і-снаваньне
уцёкі ў немарач лясную
ні ноч
ні сон
ні спадзяваньне
на кроснах зыбкага чуваньня
крозы сную
... існую

## З чаго плакала

з чаго плакала раней
не згадаю
а заплачу па месячыку
смутным
што ў рацэ драмлівай
купаўся
неабуднае кратаў багавіньне

а яно загаманіла-заныла...
як салодка плачацца па мілым

ты бадзяжны мой месячыку
княжа
...што за ліха ў крыві маёй
бруіцца?..
і чаму мяне ўжо сонейка
ня цешыць
а цябе ўсё пустка забірае

а ў дасьвецьцях капяжовыя
прылюды
як салодка плачацца па любым
і ня здумаю ніяк не ўгадаю
чым прычараваў мяне гэтак

## Танец

ці адвага ці адліга
па раскрышаным крышталі
па разьятраным вугольлі
па гадзюках
басанож

можа станчыцца ўсё ліха
можа вышуміць у шале
як наджаліць
як натоліць
не насьмерць
пярунны
дождж

## Пахмельле

Бог помач, вандроўны
прасьцяг тут няроўны
і скрутны віток утрапеньня
пры хісткім цяпельцы
якіясь тапельцы
балююць у сподзе скляпеньня

пад рэшткамі даху
зьмярцьвелага гмаху
віно даліванае зьлівай
ды скрухаю нашчай
(па гібелі йнакшай?...
па літасьці... немажлівай?)

а гібель па прыцемных кроквах
вальцуе
мой рыцару, шалік з вяровак
табе не пасуе

між танцамі ў бестурбоцьці
што права ўжо зьлева
гішпанскі замурзала боцік
твая каралева

адно аднаго паканаўшы
як сьвята – ўваскросім
а заўтра пагібелі йнакшай
папросім

а хто гэта плача
а што гэта знача
бяздоньне за выбітым шклом
тапельныя сьвяты
пахмельныя спраты
лядачая цьвержа на злом

а ўскрайкамі зроку
праз пошугі мроку
блукаюць размытыя шпілі
і млосна Нямізе
у гэтай адлізе
бы ў ёй кацянятаў тапілі

KAMUNIKAT.org

## Там яшчэ шлях

*хай паміж вамі*
*танчыць нябёсны вецер*
...і недацьмелы пратэст
скача клубок
у лясную імжыстую сьвецень
у непрадбачаны зьмест

...і паглынае апошнія
выспы прыпынку
пространь шалёнай вады
між даляглядаў
старую сьпеўную скрынку
мкнеш неўгадана куды

знаю вагнём завілася ўжо
рэшта прасторы
хоць бы ўжо неяк прыстаць
там яшчэ Шлях —
і птушак рассыпаны пёры
тых якіх тут не спаткаць

## Лятавіца

*Наталі Арсеньневай*

— Хто ты?.. — А дзяўчына з пералётаў сініх,
зьмеціла вагеньчык, на яго й сыйшла.
У вятраным гудзе настудзіла грудзі
спраглася драбочка людзкага цяпла.

— Просім, калі ласка, да бяседы наскай —
век такія краскі не зырчэлі тут!
... ці не чараўніца зьнічкай-лятавіцай
скочыла з-над хмары зводзіць Божы люд?..

— Хіба гэта зводы, ці якія шкоды,
што камусьці крылы праз мяне ўзрасьлі?..
Хіба дзеля чмураў б'юцца між віхураў,
разрываюць яскі плеціва імглы...

... Кінула вачыма ў сутань аблачынаў —
разыйшлася клінам шэрая града...
А ў прагале вышы — плешча азярына,
лебядзёў калыша лёгкая вада.

... Заміргалі сьвечкі — павіліся рэчкі
зыркага туману, расхінулі дах,
абмінулі плынна елак вершаліны
і ўліліся хваляй у Птушыны Шлях.

...Дзесь падзелась госьця... Доўга вашамосьці
  стромілі пагляды некулі туды,
дзе ў садох дасьветных пахаджае ветах,
  роніць кроплі мёду з гострай барады.

KAMUNIKAT.org

## Хросная

*Любові Турбіной*

столькі ветлых вакон адчынена
край нябёсаў заружавеў
Фея-хросная, навучы мяне
быць паўсюль як вольны павеў

столькі коней штодня запрэжана
і навіта шляхоў п'янкіх
навучы праз туман разрэджаны
адначасна ляцець па ўсіх!

і з якой тыя коні замеці
і навошта сьпех адбыцьця –
навучы мяне Фея, памятаць
на раскошным сьвяце жыцьця

KAMUNIKAT.org

## Паслушэнства

*Брату Міту,*
*братам і сёстрам*

Жыве паслушэнства рыфмарнае,
мулкае, золкае, хмарнае!
Нібы ў смузе марынар,
на гукі плыве рыфмар.

Жыве паслушэнства рыфмарскае,
тое насеньне вядзьмарскае!
Некуды ўстроміўшы твар,
ідзе паслушэнец-рыфмар.

Жыве паслушэнства рыфмоўнае,
воўчаю ўбранае воўнаю!
Нетраў сваіх валадар –
слухае лесу рыфмар.

## Гэты няісны сьвет

*І. Б.*

гэты няісны сьвет
раптам адхлыне час
браце маўчы маўчы
падае сэрца ў дол

гэты вар'яцкі дом
сочыць нязгасны зрок
падаюць сэрцы скрозь
іх паглынае плынь

крохкае хвілі скон
мроіцца водгук дзесь
нас нам вяртае плынь
поўнымі нейчых сьлёз

дзе наш сапраўдны дом
веяў азораны ўзьлёт
вымавіцца няўзнак
слоў патаемны сэнс

# Ліст

Нечакана, без адрэсу, без даты,
ліст ад бацькі, бы з вандроўкі,
крылаты
ліст ад бацькі, бы вагонь
сярод зьлівы,
напаткалі:
"А Я САМЫ ШЧАСЬЛІВЫ!"

Што ж ты сьмертухна,
*дзе тваё джала?..*
Як душа на пройме дрыжала –
і да вобліку цякла дарагога:
чуеш, татачку, ну як там, ля Бога?

ТАМ лагоднага сьвятла пералівы,
там жыве наш бацька, шчасьлівы!
Там ёсьць горад, апавіты зарою,
дзе спаткаемся мы
вечнай пароаю.

## Зьмест


*Сьвята самоты (а. т.)*..........3
*Па-над лесам*..........4
*Парушынка*..........5
*Шкло*..........6
*Калыханка маме і тату*..........7
*Сьнежная мроя*..........8
*Хваля адхлыне*..........10
*Амарылісы*..........11
*Вар'яцыя*..........12
*Яснасьць*..........14
*Даратэя*..........16
*Тонкаю ўсьмешкаю*..........18
*Горад*..........19
*Сьвітае*..........20
*Балада часу*..........21
*Pianissimo*..........23
*Зьява*..........25
*Шукаю ключы*..........26
*Шлях*..........27
*Палёт*..........28
*Падхапілі*..........29
*Сьветабудова*..........31
*Звон*..........32
*Нявымоўнасьці*..........33
*Заблукаць*..........35
*Сьцякалі ў сон*..........36

*Ты ахоўваў*..........38
*Насустрач*..........39
*Купальле*..........40
*Ёсьць раскоша*..........41
*Пасярод вятроў*..........42
*Малітва*..........43
*Чуеш*..........45
*Сьвята самоты (р. т.)*..........46
*На тым баку*..........47
*Аціхла залева*..........50
*Наўздагон*..........51
*Ты глядзіш*..........52
*Спарышы I*..........54
*Лозы гострыя*..........55
*Багоньнік*..........56
*Хто мы*..........58
*Прадоннае сонца*..........59
*Веру*..........60
*Заблукаеш*..........61
*Быццам адтуліна*..........63
*Скуль ты*..........64
*Галінкаю тою*..........65
*Забірай*..........66
*Канец блуканьня*..........68
*Спарышы II*..........69
*Жыцьцё*..........70
*Узыходзіла сонца*..........71
*Ля той ля...* ..........72
*Гэткі гармідар*..........73
*Схаваюся ад перуна*..........74
*Яшчэ табе няўцям*..........75
*Fatigée*..........76
*Жар спадзе*..........77
*Я ведаю веі*..........78
*Ноч*..........79

*Крозы*..........80
*З чаго плакала*..........81
*Танец*..........82
*Пахмельле*..........83
*Там яшчэ шлях*..........85
*Лятавіца*..........86
*Хросная*..........88
*Паслушэнства*..........89
*Гэты няісны сьвет*..........90
*Ліст*..........91

KAMUNIKAT.org

*У серыі*
*"Бібліятэчка часопісу "Дзеяслоў"*
*выйшлі кнігі:*

1. Анатоль Івашчанка. "Вершnick".
2. Васіль Быкаў. "Бліндаж".
3. Усевалад Сьцебурака. "Крушня".
4. Сяргей Дубавец. "Вершы".
5. Анатоль Кудравец. "За дальнім прычалам".
6. Леанід Дранько-Майсюк. "Цацачная крама".
7. Сяргей Прылуцкі. "Дзевяностыя forever".

KAMUNIKAT.org

**Сьцісла пра аўтара:**

Галіна Дубянецкая,
паэт, перакладчык.
Нарадзілася 20 жніўня 1962 году ў Менску.
Скончыла Інстытут замежных моваў.
Працавала ў Інстытуце літаратуры Акадэміі навук,
Скарынаўскім цэнтры, у часопісе “Крыніца”.
Жыве ў Менску.
Вершы і пераклады друкаваліся ў альманахах,
замежным і рэспубліканскім друку.

*Літаратурна-мастацкае выданьне*

Бібліятэчка часопісу "Дзеяслоў"

Выпуск 8

**Галіна Дубянецкая**

**Вершы**

Рэдактар *Барыс Пятровіч (Сачанка)*
Мастак *Генадзь Мацур*
Вёрстка *Герман Гайдніш*
Малюнкі *Алены Ткачовай*

Адказны за выпуск *Уладзіслаў Сілянок*

Здадзена ў набор 11.05.2008 г. Падпісана да друку 11.06.2008 г.
Фармат 84x108 $^{1}/_{32}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Аб’ём — ул.-выд. арк. Наклад 300 асобнікаў. Заказ №

Выдавецтва "Медисонт".

Надрукавана ў друкарні СТАА “Медисонт”,
ліцэнзія №02330/0056748 ад 22.01.04.
220004, Менск, вул. Цімiразева, 9.